*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 14. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

### *ПАЭЗІЯ*

1. Параўнайце літаратуру 1960 – 1985 гг. з сучаснай літаратурай з дапамогай **канцэптуальнай табліцы**:

| **План** | **Літаратура 1960 – 1985 гг.** | **Сучасная літаратура** |
|---|---|---|
| Храналагічныя рамкі | | |
| Грамадска-сацыяльныя падзеі | | |
| Пісьменнікі, творы | | |
| Асноўныя тэмы, праблемы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Наватарства | | |
| Заўвагі | | |

2. Назавіце паэтаў – прадстаўнікоў старэйшага і маладзейшага пакаленняў. Параўнайце стылі двух аўтараў, непадобных адзін да аднаго з дапамогай табліцы.

| **Пытанні** | **Старэйшае пакаленне** | **Маладое пакаленне** |
|---|---|---|
| Гады жыцця | | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | | |
| Асноўныя этапы творчасці | | |
| Асноўныя тэмы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Лірычны герой | | |
| Традыцыі і наватарства | | |
| Ацэнка крытыкаў | | |
| Іншае | | |

3. Сцяпан Гаўрусёў – аўтар кніг паэзіі «Штодзённы лістапад», «Профіль веку» выказаўся пра сябе так: «Я вырас пад гарматнымі стваламі». Як вы разумееце гэты радок? Хто яшчэ з паэтаў мог гэтаксама сказаць пра сябе? Падрыхтуйце **даклады** пра гэтых пісьменнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Ці можна лічыць Анатоля Вярцінскага прадстаўніком філасофскай лірыкі? У чым заключаецца яе адметнасць? Растлумачце назву зборніка і аднайменнага верша паэта «Чалавечы знак»?

5. Хто з названых намі паэтаў раней уступіў у літаратуру, хто пазней? **Расстаўце ў «храналагічным парадку» прозвішчы аўтараў**: Максім Танк, Янка Купала, Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў, Генадзь Бураўкін, Яўгенія Янішчыц, Леанід Дранько-Майсюк, і ахарактарызуйце з дапамогай толькі 5 слоў іх творчасць.

6. Падрыхтуйце вуснае **паведамленне** на адну з наступных тэм: «Гістарычная тэматыка ў паэзіі Ул. Караткевіча», «Грамадзянская лірыка Ніла Гілевіча. Тэма сучаснасці ў ёй», «Максім Танк – майстар верлібра, паэт філосаф», «Думка і пачуццё ў паэзіі Анатоля Вярцінскага», «Алесь Разанаў і мадэрнізм», «Р. Барадулін – майстар тропаў і неалагізмаў», «Тэма памяці ў паэзіі Аляксея Пысіна», «Шлях Алеся Разанава – ад рэалізму да мадэрнізму».

7. Параўнайце індывідуальныя стылі А. Вярцінскага і Р. Барадуліна.

| Пытанні | Анатоль Вярцінскі | Рыгор Барадулін |
|---|---|---|
| Гады жыцця | | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | | |
| Асноўныя этапы творчасці | | |
| Асноўныя тэмы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Лірычны герой | | |
| Традыцыі і наватарства | | |
| Ацэнка крытыкаў | | |
| Іншае | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Параўнайце арыгінал верша і яго пераклад на іншыя мовы (Р. Барадулін кнігі «Ксты», «Опрокинутое»).

10. **Падрыхтуйце разгорнутае маналагічнае выказванне паводле афарыстычных радкоў верша любімага паэта**.

11 Складзіце **анталогію** «Сучасная беларуская паэзія».